«ВІЦЯЗЬ» ЗАЎСЁДЫ Ў НАГУ З ЧАСАМ!

«Прастата выкарыстання нашай прадукцыі дорыць вам пачуццё гармоніі!» — дэвіз аднаго з флагманаў беларускай прамысловасці — ААТ «Віцязь»

Гісторыя існавання «Віцязя» пачалася ў сакавіку 1976 года. Тады было прынята рашэнне аб стварэнні тэлевізійнага завода. Праз год з канвеера сышоў першы каляровы тэлевізар другога пакалення «Віцязь-722».

У 1979-м тэлевізарам «Віцязь-722» прысвоены Знак якасці. У 1988-м з канвеера сышоў мільённы тэлевізар. У 1990-м прадпрыемства прыступіла да выпуску медтэхнікі. А ў 1991-м створаны выпрабавальны сертыфікацыйны цэнтр.

У 2001 годзе адбыўся візіт Прэзідэнта на прадпрыемства. Гадавы выпуск тэлевізараў перавысіў 300 тысяч.

ЗАЎСЁДЫ Ў ТРЭНДЗЕ

Вельмі багаты быў на падзеі 2009 год. Тады лінейку LCD-тэлевізараў папоўнілі мадэлі premium-класа ў корпусе з натуральнага дрэва і з палепшаным акустычным суправаджэннем. Быў распачаты выпуск лінейкі лічбавых цюнераў «Віцязь».

І ЗАРАДКІ ДЛЯ АЎТАМАБІЛЯЎ

Падчас экскурсіі на «Віцязь» вельмі цікава было ўбачыць электразарадныя станцыі для аўтамабіляў. Ёсць сярод іх прылады для хуткай зарадкі і тыя, якія напаўняюць энергіяй за трэць сутак. Такія ўстаноўкі можна ўбачыць на тэрыторыі аўтазаправачных станцый «Беларуснафты» — нацыянальнага аператара па развіцці электрычнага транспарту. А яшчэ яны эксплуатуюцца ў Расіі.

Ёсць у вытворцы і зарадка для індывідуальнага карыстання. Такую можна павесіць у гаражы або на фасадзе катэджа.

«Віцязь» — удзельнік рэалізацыі інавацыйнай нацыянальнай праграмы па замене аўтамабіляў на «колы», якім не патрэбны бензін.

РОВАР МАРЫ

На прадпрыемстве вырабляюць і электрычныя ровары. На такім пасля зарадкі можна праехаць да 50 кіламетраў з максімальнай хуткасцю каля 25 кіламетраў у гадзіну. Двухколавы транспарт прызначаны пераважна для эксплуатацыі ў гарадскіх умовах, але дастаткова ўпэўнена сябе адчувае на любым цвёрдым дарожным пакрыцці па-за межамі горада, запэўніваюць на прадпрыемстве. На электраровары можна перамяшчацца як у звычайным рэжыме за кошт намаганняў чалавека, так і дзякуючы ўбудаванай сістэме асісціравання педалям PAS (Pedal Assist System) — у гібрыдным рэжыме. У апошнім вялікую частку нагрузкі з веласіпедыста здымае матор-кола.

Зручнасцю пры эксплуатацыі VITYAS Dark Horse з'яўляецца незалежнасць падсілкоўвання ліхтароў — лёгказдымнага пярэдняга і задняга. Гэта дазваляе ажыццяўляць рух з уключанымі ліхтарамі пры адсутнасці акумулятара. У гэтай мадэлі выкарыстоўваецца здымны акумулятар, размешчаны ў адмысловым футарале пад багажнікам. Колы лёгка складваюцца, і не будзе праблем занесці ровар у кватэру.

ДЛЯ МЕДЫЦЫНЫ І...

Вельмі перспектыўным на «Віцязі» лічаць нішу вырабаў медыцынскага прызначэння.

Рэцыркулятары паветра «Віцязь» з'яўляюцца апрамяняльнікамі закрытага тыпу з безазонавымі бактэрыцыднымі лямпамі і прызначаны для абеззаражвання паветра памяшканняў нават у прысутнасці людзей.

Яшчэ адзін прадукт — стэрылізатары, прызначаныя для апрацоўкі насычанай вадзяной парай пад ціскам у аўтаматычным рэжыме вырабаў з тэкстылю, хірургічных інструментаў, посуду і іншых вырабаў медыцынскага прызначэння.

А сухапаветраны тэрмастат прызначаны для стварэння і падтрымання ўнутры рабочай камеры стабільнай тэмпературы, неабходнай для правядзення бактэрыялагічных, сералагічных, імуналагічных і іншых даследаванняў. Тэрмастат можа прымяняцца для інактывацыі сываратки пры пастаноўцы сералагічных рэакцый.

На «Віцязі» вырабляюць апарат квантавай тэрапіі, які бязбольна лечыць шырокі спектр захворванняў, уздзейнічаючы магнітнымі і электрамагнітнымі палямі на кропкі акупунктуры, тканкі і клеткі арганізма.

Прылада дадаткова ўкамплектавана наборам святлаводаў з палімера, якія дазваляюць узмацніць і аптымізаваць лячэбнае ўздзеянне на арганізм.

Цікавы факт: аказваецца, «Віцязь» — вытворца спецыяльных «паддонаў», якія выкарыстоўваюцца для вырабу сыроў! Іх купляе іспанская кампанія, якая спецыялізуецца на пастаўцы абсталявання заводам у розных краінах Еўрапейскага саюза.

Вельмі перспектыўны ў гэтым кірунку, канешне, і рынак ЕАЭС.

«Віцязь» — пастаянны ўдзельнік выставак. Сярод іншага «Віцязь» — лаўрэат конкурсу «Найлепшыя тавары Рэспублікі Беларусь».

Рэалізацыя прадукцыі ў Беларусі ажыццяўляецца праз сетку ўласных крамаў, а таксама пры дапамозе інтэрнэт-крамы https://multimarket.by/

СТРАТЭГІЯ РАЗВІЦЦЯ

Наконт перспектыў: ААТ «Віцязь» мае велізарны досвед, тэхнічныя і інтэлектуальныя магчымасці, шматгадовую гісторыю вытворчай і навуковай дзейнасці ў розных сегментах рынку, і гэта з'яўляецца асновай далейшага развіцця прадпрыемства.

Прадукцыя, планаваная да выпуску групай кампаній ААТ «Віцязь» для масавага спажывання, арыентавана на спажыўцоў з сярэднім і вышэй сярэдняга ўзроўнямі даходу, для розных узроставых катэгорый. Прадукцыя вытворча-тэхнічнага прызначэння па ўзроўні цаны/якасці, спажывецкіх уласцівасцяў павінна адпавядаць найлепшым сусветным узорам. І ўжо сёння гэтага дасягнулі.

***P. S.** Для кантактаў з прадпрыемствам: нумар тэлефона +375 (212) 57-16-67, omis@vityas.com*

УНП 300031652

Будаўніцтва з гарантыяй якасці

Віцебскі домабудаўнічы камбінат — адзін з флагманаў будаўнічай галіны на постсавецкай прасторы

Якасць — традыцыя!

Віцебскі ДБК — камунальнае дзяржаўнае прадпрыемства камітэта па архітэктуры і будаўніцтве аблвыканкама. Прадпрыемства стала пераможцам XV юбілейнага рэспубліканскага конкурсу «Найлепшы будаўнічы прадукт года — 2018». У гэтым прэстыжным прафесійным спаборніцтве званне найлепшага яно атрымлівала таксама ў 2014, 2015 і 2016 гадах.

Гісторыя ж прадпрыемства пачалася ў 1966 годзе. Віцебскі ДБК — найбуйнейшая арганізацыя ў Віцебскай вобласці, якая будуе буйнапанэльныя дамы.

Здаюць «пад ключ»

Прадпрыемства шматпрофільнае. У яго структуры шэраг спецыялізаваных падраздзяленняў, якія ажыццяўляюць праектаванне і розныя віды будаўніча-мантажных работ. Гэта забяспечвае магчымасць будаваць розныя аб'екты «пад ключ».

На працягу 2008—2010 гадоў прадпрыемства правяло тэхнічнае пераўзбраенне завода БПД. У рамках праведзенага тэхнічнага пераўзбраення ўсё зношанае і састарэлае абсталяванне заменена на новае, у тым ліку кампаній Olmet Italy s.r.l. (Італія), Weiler Italia s.r.l. (Італія), MEP — Macchine Elettroniche Piegatrici s.p.a (Італія), BFS (Германія). Праведзена замена абсталявання арматурнага цэха, лініі вытворчасці элементаў інжынерных сетак, лініі вытворчасці пліт перакрыццяў пустотнага насцілу, ліній па вытворчасці вонкавых і ўнутраных сценавых панэляў, лініі вытворчасці аб'ёмных элементаў, усталяваны новы раствора-бетонны вузел. Асвоены сучасныя тэхналогіі, якія дазволілі выйсці на новы ўзровень прадукцыі, павысіўшы яе прывабнасць і канкурэнтаздольнасць.

Унікальныя дамы

Вытворчыя магутнасці завода буйнапанэльнага домабудаўніцтва дазваляюць выпусціць каля 180 тысяч кубічных метраў жалезабетонных і бетонных вырабаў.

Палепшылася энергаэфектыўнасць вонкавых панэляў, паддашкавых перакрыццяў, стала шырэйшай лесвічная клетка. Вырашана праблема безбар'ернага асяроддзя: у ліфт можна трапіць адразу пры ўваходзе ў пад'езд, а не толькі з першага паверха будынка, як раней.

Вонкавыя сцены маюць трохслаёвую канструкцыю («сандвіч»), што значна павышае трываласць, а таксама тэрмічнае супраціўленне.

Віцебскі ДБК — адзіны ў Беларусі вытворца дамоў серыі 111-108. І прадпрыемству ўдалося рэалізаваць прынцыпы энергаэфектыўнасці вытворчасці. Мадэрнізаваныя секцыі жылых дамоў буйнапанэльнага домабудавання (далей БПД. — **Аўт.**) серыі 111-108 выкананы з улікам усіх дзеючых патрабаванняў і тэхнічных магчымасцяў уласнага завода.

Серыя 111-108 мае вялікія магчымасці ў свабоднай планіроўцы кватэр, з'яўляецца адзінай у нашай краіне серыяй буйнапанэльных дамоў з падоўжанымі апорнымі сценамі. Яна дазваляе ажыццявіць любую кампаноўку лесвічнай пляцоўкі: можна скласці яе з адных 1-пакаёвых кватэр, 2-х, 3-пакаёвых або разнатыпных.

Сістэма якасці канчатковай будаўнічай прадукцыі на прадпрыемстве пацверджана сертыфікатам адпаведнасці патрабаванням — СТБ ISO 9001-2009.

На прадпрыемстве атрыманы сертыфікаты адпаведнасці ўсіх відаў работ, якія выконваюцца, патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў ТР2009 / 013 / BY. Прадукцыя выпускаецца згодна з патрабаваннямі тэхнічных нарматыўных прававых актаў.

Павысілі канкурэнтаздольнасць

У 2016 годзе праведзены работы па падаўжэнні дзеяння атэстатаў акрэдытацыі лабараторыі неразбуральнага кантролю, выпрабавальнай лабараторыі, а таксама лабараторыі электрафізічных вымярэнняў.

Тады ж былі ажыццёўлены работы па аглядзе зварачнай вытворчасці на адпаведнасць патрабаванням СТБ 2349-2013. Атрымана пасведчанне аб ацэнцы зварачнай вытворчасці.

Дарэчы, у той жа год быў атрыманы спецыяльны дазвол МНС на работы і паслугі, якія складаюць дзейнасць па забеспячэнні пажарнай бяспекі.

Палітыка прадпрыемства ажыццяўляецца пад дэвізам: «Задаволенасць заказчыка якасцю выкананых будаўніча-мантажных работ — найвышэйшая ацэнка дзейнасці калектыву». Асноўныя задачы ў галіне якасці: павышэнне якасці будаўніча-мантажных і праектных работ, якія выконваюцца, канкурэнтаздольнасць прадпрыемства на базе пастаяннага тэхнічнага пераўзбраення, укаранення новых працэсаў, матэрыялаў і тэхналогій; забеспячэнне выканання работ кваліфікаваным персаналам; забеспячэнне зніжэння долі выдаткаў на энергаспажыванне ў аб'ёме выкананых работ.

І таўнхаусы ў перспектыве

Развіццё панэльнага домабудавання ідзе ў нагу з часам. Для разнастайнасці архітэктурнага аблічча гарадоў распрацаваны праект 16-павярховага жылога дома. Канструктыўная схема дамоў серыі БПД 111-108 дазволіць захаваць у вышынных варыянтах жылых дамоў свабодную перапланіроўку кватэр.

Таксама ўкаранёная мадэрнізаваная 10-павярховая блок-секцыя з наборам кватэр 1-1-1-1-1-1.

Распрацоўваецца аднаслаёвая вонкавая сценная панэль, больш тэхналагічная і простая ў вытворчасці. Адным з перспектыўных кірункаў у праектаванні і будаўніцтве з'яўляецца развіццё малапавярховай забудовы тэрыторый у выглядзе аднакватэрных дамоў і таўнхаусаў.

Матэрыялы падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.

УНП 300082594